Beacco Jean-Claude and Byram Michael. – Strasbourg: Council of Europe, 2003. – 111p.
2. Bilingual Education: Some Policy Issues/ O'Riagain Padraig, Ludi Georges. – Strasbourg: Council of Europe Language Policy Division, 2003. – 47p.
3. Воловикова М.Л. Плюралингвизм (многоязычие) как основа европейского языкового образования // Гуманитарные и социально-экономические науки. – 2006. - № 2. - С. 113 - 115.
4. Иностранный язык: учебная программа для высших учебных заведений / сост.: Л.В. Хведченя, И.М. Андреасян, О.И. Васючкова. – Минск: РИВШ, 2008. – 32 с.
5. Бердичевский А.Л. Почему дети российских соотечественников за рубежом не хотят учить русский язык? // Русский язык в центре Европы. – 2010. - № 13. – С. 129 – 131.

**Саўко У. П., Саўко І. Э. (Мінск)**

## НАВУЧАННЕ МАРФАЛАГІЧНЫМ НОРМАМ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў XI КЛАСЕ

Адной з важнейшых задач навучання беларускай мове ў старшых класах агульнаадукацыйных устаноў Рэспублікі Беларусь з’яўляецца фарміраванне культуры вуснага і пісьмовага маўлення. Вырашэнне гэтай задачы патрабуе ад настаўніка арганізацыі мэтанакіраванай сістэматычнай працы над такімі камунікатыўнымі якасцямі маўлення, як правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, выразнасць, чысціня, дарэчнасць, багацце.

Найважнейшай камунікатыўнай якасцю маўлення з’яўляецца правільнасць, якая прадугледжвае веданне нормаў літаратурнай мовы і свабоднае валоданне імі на практыцы.

Марфалагічныя нормы – адны з асноўных, што павінны быць засвоены старшакласнікамі на ўроках беларускай мовы. Гэтыя нормы вызначаюць ужыванне слова ў словазлучэннях і сказах у адпаведнасці з уласцівымі яму граматычнымі катэгорыямі, правільнае ўтварэнне формаў слова. Парушэнне марфалагічных нормаў прыводзіць да граматычным памылак.

Тыповымі граматычнымі памылкамі, абумоўленымі парушэннямі марфалагічных нормаў беларускай літаратурнай мовы, з’яўляюцца:

– няправільнае ўтварэнне і ўжыванне некаторых склонавых формаў назоўнікаў, напрыклад: формаў роднага і меснага склонаў адзіночнага ліку (*ветра, мёда, у парке* замест *ветру, мёду, у парку*), меснага склону множнага ліку (*па дарогам, па вуліцам* замест *па дарогах, па вуліцах*) і інш.;

– няправільнае вызначэнне роду і ліку назоўнікаў, напрыклад: *высокая насып, цудоўныя дубнякі* замест *высокі насып, цудоўны дубняк*;

– няправільнае ўтварэнне і ўжыванне формаў вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання прыметнікаў і прыслоўяў, напрыклад: *больш вышэйшы, найбольш важнейшыя, больш ярчэй* замест *больш высокі, найбольш важныя, больш ярка*;

– ненарматыўнае ўжыванне лічэбнікаў у формах ускосных склонаў, напрыклад: *на двух старонках, у двухтысячы дзясятым годзе, у абодвух сябровак* замест *на дзвюх старонках, у дзве тысячы дзясятым годзе, у абедзвюх сябровак*;

– памылкі пры ўтварэнні і ўжыванні займеннікаў, напрыклад: *ягоны брат, іхняя дачка* замест *яго брат, іх дачка*;

– няправільнае ўтварэнне формаў 2-й асобы множнага ліку дзеясловаў, напрыклад: *ідзеце, нясеце* замест *ідзяце, несяце*; неадрозненне некаторых дзеясловаў у формах абвеснага і загаднага ладу, напрыклад: *бярэм, плывем* – загадны лад, *бяром, прывём* – абвесны лад.

Для навучання марфалагічным нормам на ўроках беларускай мовы ў XI класе неабходна выкарыстоўваць спецыяльную сістэму практыкаванняў, у якую ўваходзяць:

1) практыкаванні на ўсведамленне вучнямі марфалагічнай нормы;

2) практыкаванні на фарміраванне ўменняў правільна ўтвараць і ўжываць марфалагічныя формы;

3) практыкаванні на знаходжанне і выпраўленне граматычных памылак, абумоўленых парушэннямі марфалагічных нормаў.

**Практыкаванні на ўсведамленне вучнямі марфалагічнай нормы** выкарыстоўваюцца на першасным этапе работы над вучэбным матэрыялам і накіраваны на тое, каб школьнікі навучыліся знаходзіць марфалагічную норму і засвоілі адпаведнае марфалагічнае правіла. Пры выкананні такіх практыкаванняў вучні могуць пры неабходнасці звяртацца да падручніка ці слоўніка, што дазволіць папярэдзіць памылкі, няправільнае ці недакладнае запамінанне тэарэтычнага матэрыялу і ў выніку будзе садзейнічаць больш якаснаму засваенню марфалагічнай нормы.

Варыянты заданняў, што выкарыстоўваюцца ў практыкаваннях першай групы, могуць быць наступныя:

а) прачытайце словазлучэнні (сказы), вызначце назоўнікі, якія ўжываюцца ў пэўнай граматычнай форме; дакажыце, што такое ўжыванне з'яўляецца нарматыўным;

б) прачытайце сказы, дакажыце, што формы ступеней параўнання прыметнікаў утвораны і ўжыты правільна;

в) прачытайце сказы, растлумачце, чаму ў іх можна ўжыць зборныя лічэбнікі, і інш.

Усведамленню марфалагічнай нормы будуць садзейнічаць і заданні на працу са слоўнікам, напрыклад:

– пастаўце назоўнікі ў форме роднага склону множнага ліку, праверце правільнаць выканання задання па слоўніку;

– выпішыце са слоўніка па пяць назоўнікаў мужчынскага роду 2-га скланення, якія ў форме роднага склону адзіночнага ліку ўжываюцца з канчаткам: а) *–а (-я)*; б) *–у (-ю)*; в) *–а (-я)* і *–у (-ю)*;

– карыстаючыся слоўнікам, дакажыце, што наступным назоўнікам ў родным склоне множнага ліку ўласцівыя варыянтныя формы.

Для ўсведамлення школьнікамі марфалагічных нормаў, засваення правіл, што іх рэгулююць, можна выкарыстоўваць заданні тэставага характару, напрыклад:

– закончыце выказванне;

– адзначце правільныя (няправільныя) сцверджанні і інш.

**Практыкаванні на фарміраванне ўменняў правільна ўтвараць і ўжываць марфалагічныя формы** накіраваны на развіццё і ўдасканаленне ўменняў старшакласнікаў утвараць формы розных часцін мовы ў адпаведнасці з марфалагічнымі нормамі. У практыкаваннях гэтай групы ў якасці дыдактычнага матэрыялу найчасцей выкарыстоўваюцца словы і словазлучэнні, што дазваляе за невялікі прамежак вучэбнага часу замацаваць матэрыял на дастаткова значнай колькасці прыкладаў, акцэнтуючы ўвагу школьнікаў на той моўнай з'яве, што вывучаецца на ўроку.

Вырыянты заданняў да такіх практыкаванняў могуць быць наступныя:

а) запішыце назоўнікі ў форме множнага ліку, абазначце канчаткі;

б) з назоўнікамі, што ў дужках, утварыце і запішыце словазлучэнні;

в) запішыце наступныя колькасна-іменныя спалучэнні, замяняючы лічбы словамі;

г) запішыце словаформы па-беларуску і інш.

Практыкаванні на ўжыванне слоў у адпаведных марфалагічных формах у сказах і тэкстах патрабуюць значных часавых затрат, аднак іх выкананне дазваляе паказаць функцыянаванне моўнай з'явы ў маўленні ва ўзаемасувязі з іншымі кампанентамі моўнай сістэмы. Акрамя гэтага, у такіх практыкаваннях можна прадугледзець паўтарэнне раней вывучанага матэрыялу, што будзе садзейнічаць удасканаленню, напрыклад, арфаграфічных, пунктуацыйных і іншых уменняў і навыкаў. Практыкаванні гэтага тыпу могуць быць з наступнымі відамі заданняў:

– спішыце сказы, ставячы словы, што ў дужках, у неабходнай форме;

– спішыце сказы, дапісваючы неабходныя канчаткі назоўнікаў;

– спішыце тэкст, ужываючы словы, што ў дужках, у адпаведнасці з марфалагічнымі нормамі;

– перакладзіце сказы на беларускую мову і запішыце іх; параўнайце канчаткі назоўнікаў у форме меснага склону множнага ліку ў беларускай і рускай мовах.

Дастаткова эфектыўнымі практыкаваннямі, накіраванымі на засваенне вучнямі марфалагічных нормаў, з'яўляюцца **практыкаванні на знаходжанне і выпраўленне граматычных памылак, абумоўленых парушэннямі марфалагічных нормаў**. Перад выкананнем такіх практыкаванняў пажадана пазнаёміць адзінаццацікласнікаў з відамі граматычных памылак, абумоўленых парушэннямі марфалагічных нормаў.

Практыкаванні гэтай групы могуць быць наступнымі:

1. Практыкаванні на супастаўленне нормы і яе парушэнняў. У якасці прыкладаў тут прапануюцца і правільны, і няправільны варыянты, а вучні павінны вызначыць, які з іх адпавядае марфалагічнай норме. Такія практыкаванні могуць мець наступныя віды заданняў:

а) параўнайце сказы і вызначце, у якіх з іх парушаны марфалагічныя нормы;

б) спішыце словазлучэнні, выбіраючы з дужак тую форму слова, якая адпавядае марфалагічнай норме;

в) супастаўце сказы з граматычнымі памылкамі і без іх і вызначце, якія марфалагічныя нормы парушаны.

2. Практыкаванні на знаходжанне граматычных памылак. Такія практыкаванні могуць быць прапанаваны ў тэставай форме, напрыклад:

а) адзначце словазлучэнні (сказы), у якіх парушаны марфалагічныя нормы;

б) адзначце словазлучэнні (сказы), у якіх не парушаны марфалагічныя нормы.

3. Практыкаванні на знаходжанне і выпраўленне граматычных памылак. Такія віды практыкаванняў мэтазгодна дастаткова часта выкарыстоўваць на ўроках беларускай мовы ў XI класе, таму што яны садзейнічаюць фарміраванню ўмення не толькі знаходзіць памылкі, але і выпраўляць іх, будаваць выказванні ў адпаведнасці з марфалагічнымі нормамі.

Віды заданняў у практыкаваннях гэтай групы могуць быць наступныя:

а) знайдзіце ў сказах назоўнікі мужчынскага роду, якія ўжываюцца з канчаткамі, не адпаведнымі норме; выпраўце граматычныя памылкі;

б) знайдзіце памылкі ва ўтварэнні і ўжыванні формаў ступеней параўнання прыметнікаў; адрэдагуйце сказы;

в) прачытайце сказы і знайдзіце сярод іх тыя, у якіх ёсць парушэнні марфалагічных нормаў; адрэдагуйце сказы;

г) адрэдагуйце тэкст, знаходзячы і выпраўляючы памылкі, абумоўленыя парушэннямі марфалагічных нормаў;

д) паназірайце за вусным маўленнем вашых аднакласнікаў, сяброў, знаёмых, зафіксуйце (калі ёсць) граматычныя памылкі, абумоўленыя парушэннямі марфалагічных нормаў. Вызначце, якім павінен быць правільны варыянт выказвання.

Такім чынам, для ўсвядомленага засваення старшакласнікамі марфалагічных нормаў неабходна выкарыстоўваць спецыяльную сістэму практыкаванняў і заданняў, у працэсе выканання якіх адбываецца як узнаўленне і засваенне неабходных тэарэтычных ведаў, так і фарміраванне ўменняў і навыкаў будаваць выказванні ў адпаведнасці з марфалагічнымі нормамі беларускай літаратурнай мовы.

**Смольская Т. М., Ялоўская Э. А. (Мінск)**

## МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ НА ЗАНЯТКАХ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА) СА СТУДЭНТАМІ-ЮРЫСТАМІ

Шматлікія метадычныя даследаванні і распрацоўкі праграм аб вышэйшай адукацыі прытрымліваюцца таго палажэння і ўхваляюць яго, што падрыхтоўка спецыялістаў у вышэйшых навучальных установах павінна быць комплекснай. З гэтага пастулату вынікае, што дысцыпліны і курсы, якія падбіраюцца для той ці іншай спецыяльнасці і зацвярджаюцца адпаведным міністэрствам, уяўляюць сабой пэўны цэласны арганізм, у якім усе складнікі цесна ўзаемадзейнічаюць, прычым, чым больш дасканалая і высокая ступень узаемадзеяння, тым больш высокая ступень падрыхтаванасці тых, для каго і на каго гэтая сістэма працуе.

У гэтым рэчышчы хацелася б прадэманстраваць пэўныя практычныя напрацоўкі, што набыты пры выкладанні курса “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” на юрыдычным факультэце.

Сама назва прадмета гаворыць пра тое, што найбольшая ўвага надаецца пытанням спецыяльнай лексікі ў юрыспрудэнцыі.

Пры вывучэнні тэмы “Склад беларускай мовы паводле ўжывання” спачатку неабходна патлумачыць аўдыторыі, што слоўнікавы склад